View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка”

Кафедра гісторыі Беларусі

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ НОВАЙ І НАВЕЙШАЙ ГІСТОРЫІ КРАІН ЕЎРОПЫ І ЗША: даследаванні, праблемы, пошукі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Матэрыялы Рэспубліканскай*
*навукова-тэарэтычнай канферэнцыі*
г. Мінск, 28 сакавіка 2008 г.

Мінск, 2008

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

Рэдкалегія:

першы прарэктар БДПУ, старшыня арганізацыйнага камітэта канферэнцыі *А.І. Андарала*;

кандыдат педагагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі БДПУ *І.І. Багдановіч*;

кандыдат гістарычных навук, дацэнт *І.В. Варывончык*;

доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *А.П. Жытко*;

доктар гістарычных навук, прафесар, дэкан гістарычнага факультэта БДПУ *М.М. Забаўскі*;

кандыдат гістарычных навук, старшы выкладчык *З.І. Канапацкая*;

доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры новай і навейшай гісторыі БДПУ *Г.А. Космач*;

доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі БДПУ *А.М. Люты*;

доктар гістарычных навук, дацэнт *М.І. Мініцкі*;

начальнік вучэбна-выдавецкага цэнтра БДПУ *В.Я. Наваградскі*;

доктар гістарычных навук, прафесар *В.А. Пілецкі* (адк. рэд.);

кандыдат гістарычных навук, дацэнт *А.Ф. Рацько*;

доктар гістарычных навук, прафесар *М.К. Сакалоў*;

кандыдат гістарычных навук, дацэнт *М.М. Сакалоў*;

кандыдат гістарычных навук, дацэнт *А.Г. Субоцін*;

доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі старажытных цывілізацый і сярэдневякоўя БДПУ *У.В. Тугай*;

кандыдат гістарычных навук, дацэнт *П.А. Тупік*;

доктар гістарычных навук, прафесар *В.М. Фамін*;

доктар гістарычных навук, прафесар *І.Р. Чыкалава*;

кандыдат гістарычных навук, дацэнт *Л.Л. Шкуцько*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ДА ПЫТАННЯ ГІСТАРЫЯГРАФІІ ЛАТЫШСКІХ СТРАЛКОЎ (20-Я – 30-Я гг. ХХ ст.)

Тугай У.В., г. Мінск

Значныя вынікі былі дасягнуты ў 20-я – першай палове 30-х гг. ў даследаванні гісторыі латышскіх стралкоў. У друку выйшла некалькі буйных публікацый, дакументаў і матэрыялаў, сотні нарысаў, успамінаў і артыкулаў. Асобныя пытанні тэмы закраналіся ў выданнях, якія былі прысвечаны гісторыі рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, Савецкай Латвіі 1919 г., замежнай інтэрвенцыі і грамадзянскай вайны. У выступлениях кіруючых дзеячоў Савецкай дзяржавы і ваеначальнікаў Чырвонай Арміі падкрэсліваўся ўклад стралкоў у абарону заваёў Вялікага Кастрычніка, іх гераізм у барацьбе з ворагамі рэвалюцыі.

Шмат увагі гістарычнаму шляху стралкоў удзялялі вядомыя дзеячы рэвалюцыйнага руху Латвіі. Адным з першых ацэнку арганізацыі латышскіх стралковых батальёнаў падчас першай сусветнай вайны даў П.Стучка [1]. Ён паказаў, што “латышская буржуазія, якая выступала за фарміраванне “нацыянальных частак”, праследвала вузкакласавыя мэты, спадзявалася нажыць палітычны капітал на крыві сваіх суайчыннікаў, - рабочых і сялян Латвіі, апранутых у салдацкія шынялі. П.Стучка высока ацэньваў значение ІІ з’езда латышскіх стралковых камітэтаў і прынятых ім 17 мая 1917 г. рашэнняў: латышскія стралкі адкрыта перайшлі на бок бальшавікоў. Ен пісаў: 17 мая ў летапісу расійскай, а гэта азначае і сусветнай рэвалюцыі займае асобную старонку пад назвай “латышскі стралок”. Гэта быў не дзень нараджэння латышскага стралка, а, хутчэй за ўсё, яго адраджэнне. Гэта быў дзень, калі латышскія стралкі не паасобку, а як заўсёды арганізавана, усе як адзін, перайшлі на бок рэвалюцыі, і адразу ж сталі ў рады яе змагароў [2].

У працах П.Стучкі закраналіся пытанні, звязаныя з палажэннем на фронце, аналізаваўся ход ваенных аперацый, абмяркоўваліся прынцыпы арганізацыі ўзброеных сіл Саветаў. П.Стучка не раз падкрэсліваў вернасць латышскіх стралкоў Савецкай уладзе, указваў на тое, што стралкі ахоўвалі Савецкі ўрад у Петраградзе і Маскве, прымалі ўдзел у падаўленні контр-рэвалюцыйных (чытай антыбальшавіцкіх) мецяжоў, змагаліся на рашаючых накірунках грамадзянскай вайны [3].

Канцэптуальную значнасць мае тэзіс П. Стучкі аб непарыўным адзінстве латышскіх стралкоў з усімі воінамі Чырвонай Арміі [4]. У сваіх працах П. Стучка прыводзіць некалькі эпізодаў, якія паказваюць адносіны правадыра сусветнага пралетарыяту да стралкоў. Адзін з іх звязаны з пачаткам 1918 г, калі У.І. Ленін запрасіў да сябе ў Смольны П. Стучку і К. Петэрсана і абмяркоўваў з імі пытанне аб сваім выступленні перад латышскімі стралкамі. Згадваецца не менш важны факт, які адносіцца да ліпеньскага мецяжу 1918 г. у Маскве. У. Ленін запрасіў да сябе ў гэты крытычны момант П. Стучку, Ю. Данішэўскага і К. Петэрсана і абмяркоўваў з імі склаўшаеся палажэнне. Па словах П.Стучкі, у гэты рашаючы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

момант У. Ленін поўнасцю давяраў Латышскай стралковай дывізіі, лічыў яе адной з самых адданых рэвалюцыі воінскіх часцей Чырвонай Арміі.

Заслугоўваюць увагі прыводзімыя П. Стучкай факты, звязаныя з перакідам з Заходняга на Паўночны фронт Латышскай дывізіі восенню 1919 г. - у самы драматычны момант грамадзянскай вайны, калі над Савецкай рэспублікай навісла сур'ёзная небяспека, а дзенікінскія войскі набліжаліся да Арла і Тулы і пагражалі Маскве.

Па словах П. Стучкі, ЦК РКП(б) па асабісятым указанні У. Леніна даў дырэктыву аб адпраўцы латышскіх стралкоў у раён Арла.

Некалькі прац, прысвечаных латышскім стралкам, належаць пяру Ю. Данішэўскага [5]. У іх прааналізавана дзейнасць партыйнай арганізацыі, Іскаластрэла, прыведзены факты адпраўкі прапагандыстаў з латышскіх палкоў у часці V арміі. Ю. Данішэўскі адным з першых у савецкай гістарыяграфіі даў апісанне ўдзелу Латышскай стралковай дывізіі ў разгроме дзенікінскіх войскаў, ацэнку Арлоўска - Кромскай аперацыі, як паваротнага моманта ў падзеях восені 1919 г. на Паўночным фронце.

Неабходна падкрэсліць, што ў гістарычнай літаратуры 20-х - першай палове 30-х гг., прысвечанай грамадзянскай вайне і выдадзенай у Савецкім Саюзе, нагадванне пра баявую дзейнасць латышскіх стралкоў было даволі частым. Так, У.А. Антонаў-Аўсеенка прыводзіць эпізоды знаходжання латышскіх стралкоў у Петраградзе і аб іх удзеле ў разгроме контррэвалюцыйнага мяцяжа Каледзіна [6].

У.Д. Бонч-Бруевіч высока ацэньвае баявыя якасці стралкоў, падкрэслівае іх адданасць рэвалюцыі, дысцыплінаванасць і расказвае аб удзеле стралкоў ва ўмацаванні рэвалюцыйнага парадку ў Петраградзе.

Некаторыя факты з гісторыі сумеснай барацьбы чэкістаў і латышскіх стралкоў супраць контррэвалюцыі можна знайсці ў працах М. Лацыса і Я. Петэрса [7].

Значная ўвага баявой дзейнасці стралкоў на паўднёвым фронце восенню 1919 г. надавалася ў манаграфіі ваеннага гісторыка К.М. Галіцкага [8] і ў кнізе вядомага военачальніка грамадзянскай вайны А.І. Ягорава [9]. Дакладныя веды ходу баявых аперацый, атаксама аналіз шматлікіх крыніц дазволілі аўтарам гэтых прац выказаць аўтарытэтныя думкі наконт усёй аперацыі ўвогуле, а таксама даць ацэнку баявой падрыхтаванасці і аператыўнаму майстэрству ўсёй Латышскай стралковай дывізіі.

Першую спробу паказаць баявы шлях стралкоў з моманта стварэння латышскіх нацыянальных батальёнаў у 1915 г. да канца грамадзянскай вайны зрабіў былы камандзір Латышскай стралковай дывізіі і галоўнакамандуючы ўзброенымі сіламі РСФСР І. Вацэціс [10]. У сваёй працы І. Вацэціс на багатым фактычным матэрыяле асвятляе баявую дзейнасць 5-га Земгальскага палка, 6-га латышскага палка, Зводнай роты латышскіх стралкоў, якія ахоўвалі Смольны і Крэмль. Вялікую каштоўнасць прадстаўляюць старонкі, дзе аўтар расказвае аб удзеле ў падаўленні леваэсэраўскага мяцяжу ў Маскве.

Сур'ёзнае навуковае значэнне мела падрыхтоўка да друку буйных навуковых выданняў "История латышских стрелков" і "Латышский

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

революционный стрелок”. Дзякуючы працам цэлага рада аўтараў і перш-наперш К. Іакума, Ю. Данішэўскага, М. Драудзіня, А. Фелдманіса, Р. Баузэ, І. Вацэціса і інш. значна канкрэтызавана прадстаўленне аб баявой дзейнасці шскіх стралкоў па абароне Савецкай улады.

Такім чынам, у 20-х - першай палове 30-х гг. пад кіраўніцтвам Камісіі па гісторыі латышскіх стралкоў было надрукавана шмат буйных публікацый, было выдадзена некалькі гістарычных работ, сотні артыкулаў і ўспамінаў, уведзена ў навуковы абарот вялікая колькасць фактычнага матэрыялу пра барацьбу латышскіх стралкоў за Савецкую уладу.

Літаратура

1. Стучка, П. Ленин полагался на латышских стрелков// О Ленине. Воспоминания революционеров Латвии/ П. Стучка. - Рига, 1959. С. 13-16; Стучка, П. Письмо из Риги// В борьбе за Октябрь/ П. Стучка.- Рига, 1959. С. 65-70; Стучка, П. Падение «красной» Риги. (Записки очевидца)// В борьбе за Октябрь/ П. Стучка.- Рига, 1959. - С. 148—154.
2. Stucka, P. Latvja strelnieku qoda diena/ P. Stucka// KrC. - 1924, 31. maija.
3. Стучка, П. Ленин полагался на латышских стрелков/ П. Стучка. - Рига, 1923. – 26 с.
4. Stucka, P. Ievadam. - LSV, 1. sej, 1d, III—VIII pp.
5. Danisevskis I. (Vina uzstasanas Latviesu strelnieku puiku Apyienotas padomes 1917. data 12—17 maija sede). - LSV, 1. sej., 2. d., 587, 589, -595, Ipp; Danisevskis I. Latviesu strelnieku-sacialas revolucijas armija. -1. sej., 2. d., I—XXIIII pp.
6. Антонов-Овсеенко, В. Записки о гражданской войне: в 2 т./ В. Антонов-Овсиенко. - М., 1924. – 2 т.
7. Лацис, М. (Судрабс) Чрезвычайные комиссии по борьбе с контрреволюцией/ М. Лацис (Судрабс) – М., 1921. – 62 с.; Петерс, Я.Х. Воспоминания о работе в ВЧК в первый год революции/ Я.Х Петерс. - ПР, 1924, № 10, С. 5—32.
8. Галицкий, К. Орловско-Кромское сражение/ К. Галицкий. – М., 1932. – 249 с.
9. Егоров, А. Разгром Деникина/ А. Егоров. – М., 1931. – 232 с.
10. Vacietis I. Latviesu strelnieku vesturiska nozime. 1.1922. XII, 163 Ipp; 2. M., 1924. - 411pp.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ